Беларуская Дзяржаўная бібліотэка заснавана ў 1921 годзе ў Менску і зараз мае каля 400.000 томаў. Асноўны фонд бібліотэкі склаўся з купленых бібліотэк Карскага, Янчука, Барысава, Ісаева, Грота, Гольдштэйна і інш., а таксама шляхам іншых паступленьняў, з якіх асабліва вылучаюцца бібліотэкі Каладзеева, Карнілава, Случэўскага і інш. Дзейнасьць бібліотэкі абхоплівае ўсе віды бібліотэчнай і бібліографічнай працы. Адпаведна гэтаму бібліотэка складаецца з аддзелаў: агульнага, беларускага, яўрэйскага і польскага, марксызму і савецкага будаўніцтва і Беларускага бібліографічнага бюро ды Беларускай кніжнай палаты. Карыстаньне кнігамі Бібліотэкі адбываецца ў дзьвёх чытальнях, у якіх па даных леташняга году было выдана 220.905 кніг на 154.163 наведваньні. Кніжная палата зьбірае аба-

вязковыя паасобнікі ўсіх выданьняў з тэрыторыі БССР, вядзе сталы абмен кнігамі з самымі рознымі ўстановамі каля 30 дзяржаў Амэрыкі, Азіі, Афрыкі і Эўропы, з 1925 году выдае „Летапіс беларускага друку“, у якім зьмяшчае бібліографію ўсёй сучаснай кніжнай продукцыі на тэрыторыі БССР. Бібліографічнае бюро організуе картотэку беларускай бібліографіі і дае бібліографічныя даведкі ўстановам і ўсім жадаючым. Ім ужо зроблена каля 80.000 картак беларускага бібліографічнага рэпэртуару і выдана бібліографія беларускіх выданьняў 1917—1924 г. г. і бібліографія пэрыодычнага друку на беларускай мове ды разам з Інбелкультам бібліографія этнографіі; падрыхтаваны да друку: бібліографія зьместу беларускіх часопісаў 1917—1927 г. г. і бібліографія паасобных выданьняў і артыкалаў па ўсіх галінах беларусазнаўства 1917—1927 г. Апрача таго, бібліографічныя матар'ялы Бюро часта друкуюцца ў розных часопісях з адпаведнаю адзнакаю, а то і без яе. Распачата праца па выданьню рэфэратаў і аглядаў з паасобных галін беларусазнаўства. У 1928 г. Бібліотэка адчыніла свае аддзяленьні ў Віцебску і Магілеве.